жыць самі па сабе, тут гаварылася на нябачаныя дагэтуль тэмы наркаманіі, прастытуцыі, адзіноты. Такім чынам у канцы 1980-х дзеці зноў сталі няшчаснымі, а кіно зноў загаварыла, што дзіця пакутуе ад таго, што мы не можам справіцца з рэчаіснасцю.

— На твой погляд, савецкае дзіцячае кіно можа «зайсці» сучасным дзецям?

— Дзеці маіх сяброў скачуць пад «Прыгоды Бураціна». Ёсць рэчы, што, як ні дзіўна, яшчэ працуюць — у асноўным гэта казкі, бо яны ўніверсальныя і не носяць прыкмет эпохі. Фільмы «Па сакрэце ўсяму свету» альбо «Дзяніскавы апавяданні» дакладна сённяшнім дзецям незразумелыя, для іх гэта ўжо іншая рэальнасць. Але як мінімум «Пра Чырвоную Шапачку» і «Прыгоды Бураціна» мы знялі для ўсіх.

— У беларускага дзіцячага кіно быў свой перыяд росквіту — калі ён здарыўся і з чым гэта было звязана?

— Усё сышлося ў 1970-х. «Беларусьфільм» пераехаў у новы будынак, з'явіліся рэсурсы і магутнасці, тут працавалі таленавітыя рэжысёры і крутая рэдактарская служба, што здабывала добрыя сцэнарыі, — і здарыўся выбух усяго, у тым ліку дзіцячага кіно. Яшчэ ў пачатку 1960-х на кінастудыю прыйшоў Уладзімір Бычкоў, у якога быў талент здымаць для дзяцей, у 1970-х з'явіліся Мікалай Калінін, Леанід Нячаеў, Генадзь Харлан. Уся сістэма, пры тым, што ў ёй былі канфлікты і групоўкі, якія між сабой не сябравалі, выдатна працавала, таму з'явіліся дзясяткі цудоўных фільмаў для дзяцей — «Корцік» і «Бронзавая птушка» Калініна, «Зімародак» Вячаслава Нікіфарава, «Расклад на паслязаўтра» Ігара Дабралюбава, «Па сакрэце ўсяму свету», фільмы Нячаева.

«У канцы 1980-х дзеці зноў сталі няшчаснымі, а кіно зноў загаварыла, што дзіця пакутуе ад таго, што мы не можам справіцца з рэчаіснасцю».

— Ты ахарактарызавала сваю кнігу як спробу адказаць на пытанне, якога гледача вырасціла савецкае дзіцячае кіно. Думаеш, яно сапраўды сыграла сваю ролю ў фарміраванні людзей?

— Так, кіно дае вобразы, да якіх вяртаешся дарослым, мы добра запамінаем тое, што глядзелі ў дзяцінстве. Я, напрыклад, стала разумець, адкуль некаторыя мухі ў галаве маёй мамы: яна нарадзілася пасля вайны і належыць да пакалення піянераў-герояў, якія абстрактную грамадскую ідэю ставяць вышэй за ўсё і ў кожнай справе здзяйсняюць подзвіг. Вядома, маю маму сфарміравалі не толькі дзіцячыя фільмы, але кіно было часткай выхаваўчай савецкай сістэмы. Мне ідэалы мамы ўжо падаюцца дзіўнымі, бо я не расла з візуальнымі вобразамі накшталт партызанскага памочніка Валодзі Дубініна ў фільме «Вуліца малодшага сына» Льва Голуба. Я мела іншыя прыклады — Бураціна, які не здзяйсняў ніякіх подзвігаў, а проста ішоў, не дайшоў, вярнуўся, і яму чамусьці «абламіўся» скарб. Вось і я чакаю, калі мне «абломіцца» скарб. У цэлым савецкае кіно вырасціла гледача, які вельмі спадзяецца, што рэальнасць добрая, ідэалістычная, сацрэалістычная, а ў выпадку чаго — прыйдзе дарослы і ўсё выправіць.

— А ці ёсць у нас сёння дзіцячае кіно?

— Сёння мы намагаемся вярнуць былое, не разумеючы, што як раней ужо не будзе. Спроба аднавіць размову з дзецьмі павінна падтрымлівацца, але яны змяніліся, у іх іншыя інтарэсы і іншая рэальнасць, якую наша кіно не разумее. Звычайна сучасныя дзіцячыя фільмы ўяўляюць сабой кальку з дарослага жыцця, маўляў, спарадзіруем яго і дзецям будзе смешна. Калі ў савецкі час з дзецьмі стараліся абмяркоўваць нейкія тэмы, то цяпер іх проста забаўляюць, каб яны добра прабавілі час і пажадана без складаных эмоцый — ім прапаноўваюць не адчуць смутак, скруху ад страты ці віну, а толькі парагатаць над тым, як людзі выпутваюцца з клаўнады, што эмацыянальна абядняе. Сітуацыя нагадвае 1930-я, калі сістэме было па вялікім рахунку пляваць, што там дзеці думаюць і якія ў іх праблемы, — яна сама сабе расказвала пра цудоўную савецкую краіну і як у ёй трэба жыць. Сёння зноў і аўтар, і адрасат нікому незразумелыя, нават сам фільм як бы непатрэбны. Беларускім дзіцячым кіно мы расцім неразборлівага ў сваіх эмоцыях чалавека, але, дзякуй богу, яго ніхто не глядзіць, таму ўрон невялікі.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Юбілей

Беларусы і палякі сумесна прачыталі «Пана Тадэвуша»

Акцёры Купалаўскага тэатра разам з калегамі з беластоцкага тэатра імя Аляксандра Венгеркі прачыталі «Пана Тадэвуша» анлайн. Чытанне прайшло 21 мая як частка святкавання Купалаўскім свайго 100-гадовага юбілею. Такім фарматам тэатр замяшчае запланаваныя на соты сезон абменныя гастролі з тэатрамі-партнёрамі, якія былі адменены праз распаўсюджванне каранавіруса.

Беларусы чыталі паэму на беларускай мове, а палякі — на польскай, то-бок на мове арыгінала. Калі творы Адама Міцкевіча дагэтуль рознага кшталту довадамі дзеляцца паміж нашымі краінамі, то праз сумеснае чытанне сцвярджаюцца як сумесная спадчына.

Падзея адбылася па ініцыятыве Купалаўскага тэатра пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску. Ад Купалаўскага «Пана Тадэвуша» чыталі народны артыст Беларусі Аляксандр Падабед, Павел Харланчук-Южакоў, Марта Голубева і Крысціна Дробыш.

Драматычны тэатр імя Аляксандра Венгеркі прадстаўлялі актрысы Крыстына Кацпровіч-Сакалоўская, Данута Бах, Іаланта Бароўская і Катажына Мікевіч. У чытанні былі таксама рэжысёр Алена Ганум і журналісты Польскага радыё Беласток Дарота Сакалоўская і Зміцер Косцін у якасці мадэратараў з польскага боку.

Трэба дадаць, што з найбуйнейшым творам Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» купалаўцы выступаюць не ўпершыню: у 2014 годзе рэжысёр і мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін паставіў паводле паэмы аднайменны спектакль. Купалаўскі працягне прапаноўваць альтэрнатывы традыцыйнаму тэатральнаму жыццю — яго ініцыятывы лепш шукаць на сайце калектыва.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

На сцэне

Шэкспір, дзень нараджэння Вялікага і опера Бернстайна

Пяць тэатраў, у якія можна схадзіць анлайн на будучым тыдні

Ковід не спыняецца, таму мы ўсё яшчэ вымушаны трымацца альтэрнатыўных варыянтаў культурнага баўлення часу. І трэба сказаць, альтэрнатыва аказваецца не такой сумнай, пакуль мы можам, седзячы на канапе, глядзець тэатральныя пастаноўкі з усяго свету — як з найвядомейшых пляцовак, так і ад калектываў-«адкрыццяў». Вядома, паводле пэўнага падыходу глядзець спектакль на плоскім экране — тое ж, што вывучаць жывапіс па рэпрадукцыях у кнізе, але такі фармат усё яшчэ прапануе гледачу нябачаную раней разнастайнасць. Таму на наступным тыдні прапануем зрабіць яшчэ некалькі выхадаў у тэатр і ў падборцы з пяці пастановак, даступных для бясплатнага прагляду анлайн, збіраем балет, Шэкспіра, Дзень нараджэння нашага Вялікага, Леанарда Бернстайна і «самы шакавальны» спектакль лонданскай сцэны.

«Макбет» у тэатры «Берлінер Ансамбль».

«Рамэа і Джульета» ў Фінскай нацыянальнай оперы

Тыя, хто цікавіцца операй і балетам, напэўна, ужо паглядзелі запісы сусветна вядомых пляцовак у Вене, Лондане, Берліне альбо Метраполітэн-опера. Але выдатных тэатраў, што ставяць гэтыя жанры, куды больш, і мы прапануем адкрыць адзін з іх — Фінскую нацыянальную оперу, гісторыя якой пачалася яшчэ ў XIX стагоддзі. Сёння ў калектыве, што налічвае 530 чалавек, 78 балетных танцораў, і іх работу можна ўбачыць на сайце тэатра oopperabaletti.fi, дзе выкладзена некалькі пастановак, сярод якіх бессмяротны сюжэт Уільяма Шэкспіра і адпаведны балет Сяргея Пракоф'ева «Рамэа і Джульета». Трагедыя дваіх закаханых даступная для прагляду да 18 лістапада, а апроч гэтага ў Фінскай оперы можна паглядзець балеты «Жызэль», «Сон у летнюю ноч» ды іншыя пастаноўкі.

«Макбет» у «Берлінер Ансамбль»

«Берлінер Ансамбль» — адзін з самых вядомых нямецкіх тэатраў. Ён быў заснаваны ў 1949 годзе класічным ужо драматургам Бертольдам Брэхтам і дагэтуль, апроч іншага, ставіць п'есы свайго заснавальніка. Але цяпер паказваецца не Брэхт, а шэкспіраўскі «Макбет» — трагедыя пра караля Макбета і яго прагу ўлады, з-за якой ён разам з жонкай здзяйсняе шэраг крывавых распраў. У крыві ды ў пінжаку вы яго і ўбачыце — «Берлінер Ансамбль» ставіць усё ж не Шэкспіра, а яго адаптацыю, здзейсненую вядомым нямецкім драматургам, рэжысёрам і, дарэчы, пераемнікам Брэхта Хайнерам Мюлерам. Пастаноўку з перакладам на англійскую мову можна паглядзець на сайце «Берлінер Ансамбль» berliner-ensemble.de да 28 мая.

«Дзень адкрытых дзвярэй» у нашым Вялікім тэатры

Не спектакль, але тым не менш падзея — ужо некалькі гадоў запар 25 мая беларускі тэатр оперы і балета адзначае свой дзень нараджэння ў фармаце «Дня адкрытых дзвярэй». Звычайна, каб адкрыць для сябе тэатральнае закуліссе, будынак наведвае некалькі тысяч чалавек, што стала своеасаблівай традыцыяй. Сёлета праз каранавірус звычайны фармат не можа быць вытрыманы, але адмаўляцца ад традыцыі калектыў не стаў: «Дзень адкрытых дзвярэй» пройдзе так ці інакш. У панядзелак на сайце і на старонках Вялікага ў сацыяльных сетках закуліссе можна будзе ўбачыць анлайн, тым больш што работа тэатра не спыняецца. Тут будзе паказаны шэраг інтэрв'ю — з мастацкім кіраўніком Валянцінам Елізар'евым, галоўным балетмайстрам Юрыем Траянам, галоўным хармайстрам Нінай Ламановіч, салістамі Ігарам Артамонавым, Канстанцінам Кузняцовым, Аксанай Волкавай і іншымі — і вячэрні канцэрт-сюрпрыз, у якім выканаўцы прадставяць свае любімыя нумары розных жанраў. «Дзень адкрытых дзвярэй» пачнецца а трэцяй гадзіне, а канцэрт — а сёмай.

«Хваляванні на Таіці» ў «Паўночнай оперы»

Брытанская «Паўночная опера», што месціцца ў горадзе Лідс, да канца месяца паказвае гадзінную оперу «Хваляванні на Таіці». Твор у сярэдзіне мінулага стагоддзя напісаў Леанард Бернстайн — ён паглыбляецца ў жыццё амерыканскага сярэдняга класа і з джазавымі матывамі расказвае пра канкрэтную сям'ю, у якой закаханыя адно ў аднаго муж-бізнесмен і жонка — хатняя гаспадыня тым не менш перажываюць крызіс шлюбу. На сцэне разыгрываецца адзін дзень з жыцця сям'і са сваркамі, спрэчкамі і паходам у кінатэатр на фільм «Хваляванні на Таіці». Кажуць, што матыў для напісання оперы Бернстайну даў уласны досвед альбо, ёсць версія, досвед яго бацькоў. Паглядзець запіс з англійскімі субцітрамі — ён будзе даступны да 1 чэрвеня ўключна — можна на сайце operanorth.co.uk.

Cyprus Avenue у лонданскім Каралеўскім прыдворным тэатры

The Guardian у свой час назвала «Кіпрскую авеню» найбольш шакавальным спектаклем на лонданскай сцэне — гэта было ў 2016 годзе, калі рэжысёр Вікі Фезерстоўн у Royal Court Theatre альбо, можна сказаць, Каралеўскім прыдворным тэатры паставіў «чорную» камедыю Дэвіда Айрлэнда, якая ўтрымлівае нецэнзурную лексіку, сцэны гвалту і абмеркаванне рэлігіі. Па сюжэце галоўны герой Эрык Мілер у выніку памутнення розуму прымае сваю пяцітыднёвую ўнучку за палітыка Джэры Адамса і праз экстрэмісцкае мінулае адчувае, што знаходзіцца ў небяспецы і мусіць дзейнічаць. Як характарызуюць яе стваральнікі, гэта пастаноўка пра чалавека, што мусіць змагацца са сваім мінулым і баіцца будучыні. Спектакль з англійскімі субцітрамі ў кінаадаптацыі можна паглядзець на сайце royalcourttheatre.com.

Вольга МІЦКЕВІЧ.